ГРАМАДСКАЯ КАМПАНІЯ

«ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ»

# ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ШОСТАГА СКЛІКАННЯ

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання**

**29.08.2016–4.09.2016 г.**

Назіранне ажыццяўляюць РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў рамках кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

## ВЫСНОВЫ

- *працягваецца агітацыйная кампанія кандыдатаў, якая ў беларускім грамадстве не мае вялікага рэзанансу; пасля трансляцый выступаў кандыдатаў па тэлебачанні і радыё многія прэтэндэнты на дэпутацкі мандат спынілі сустрэчы з выбарцамі;*
- *значную агітацыйную актыўнасць праяўляюць кандыдаты ад улады, якія выкарыстоўваюць адміністрацыйны рэсурс, задзейнічаюць электронныя і друкаваныя СМІ;*
- *адзначаюцца зняцці кандыдатур: на сёння з перадвыбарчай кампаніі сышоў 31 кандыдат у дэпутаты, што складае 6% ад агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў[1]; стварылі свае выбарчыя фонды і адкрылі спецыяльныя рахункі 355 кадыдатаў, гэта 68% ад зарэгістраваных ці 72% ад колькасці кандыдатаў, якія працягваюць удзел у выбарах[2];*
- *мясцовыя органы ўлады і прадстаўнікі праўладных грамадскіх аб’яднанняў ва ўсіх рэгіёнах праводзяць мабілізацыйныя мерапрыемствы па арганізацыі выбараў, з кіраўнікамі УВК арганізоўваюцца сходы, семінары і трэнінгі;*

---

[1] Даступна на: http://www.belta.by/politics/view/vybory-2016-esche-dva-kandidata-v-deputaty-snjalis-s-elektoralnoj-parlamentskoj-gonki-v-belarusi-208274-2016/.
[2] Даступна на: https://belarusbank.by/ru/deyatelnost/30809/30810.

- *выбарчыя камісіі атрымліваюць установку на сумесную і адначасовую працэдуру падліку галасоў, якая не дазволіць назіральнікам непасрэдна назіраць падлік бюлетэняў;*
- *адбыліся сустрэчы назіральнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» з прадстаўнікамі місіі БДІПЧ АБСЕ, акрэдытаванымі ў рэгіёне.*

## I. ПАДРЫХТОЎКА ДА ГАЛАСАВАННЯ

Мясцовыя органы ўлады і прадстаўнікі праўладных грамадскіх аб'яднанняў ва ўсіх рэгіёнах праводзяць мабілізацыйныя мерапрыемствы па арганізацыі выбараў. З кіраўнікамі УВК арганізоўваюцца сходы, семінары і трэнінгі.

У Бабруйскім райвыканкаме адбыўся другі рэгіянальны сход дэпутатаў, удзельнікамі якога былі дэпутаты раённага і сельскіх Саветаў дэпутатаў, прадстаўнікі мясцовага самакіравання. Акрамя пытанняў, звязаных з рэалізацыяй Указа «Аб аплаце жыллёва-камунальных паслуг, што аказваюцца насельніцтву», абмяркоўвалася правядзенне выбараў, па якім дакладала начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай работы райвыканкама.

У Магілёве «небяспечныя» для УВК сітуацыі ў дзень выбараў адпрацоўваліся на трэнігу для сябраў УВК, які вёў начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай работы адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Магілёва Дзмітрый Цімафеенка.

Першая сітуацыя: назіральнік падаў пісьмовую заяву з просьбай лічыць бюлетэні па адным, называючы пры гэтым, за каго ў ім прастаўлена адзнака, парадкавы нумар гэтага бюлетэня ў падліку, і паказваць яго ўсім прысутным. Старшыня УВК, паводле вядучага трэнінга, павінен адмовіць назіральніку. Матывіроўка: не прадугледжана заканадаўствам, парадак падліку вызначае сама камісія.

Другая сітуацыя: падчас падліку галасоў назіральнік просіць дазволу ў старшыні УВК падысці бліжэй да стала, каб бачыць пазнакі ў бюлетэнях. Старшыня УВК, паводле вядучага трэніга, таксама павінен адмовіць назіральніку. Матывіроўка: патрабаванне назіральніка не прадугледжана выбарчым заканадаўствам, ён павінен знаходзіцца ў тым месцы, дзе яму ўказаў старшыня. Таксама было падкрэслена, што выбарчае заканадаўства і пастановы ЦВК не вызначаюць мінімальную адлегласць ад стала падліку бюлетэняў, на якой мае права знаходзіцца назіральнік. Такім чынам, гэтае пытанне вырашае непасрэдна старшыня. Адзінае права назіральніка – знаходзіцца непасрэдна насупраць стала і бачыць, як сябры камісіі перабіраюць і лічаць бюлетэні. Сябры камісіі павінны знаходзіцца па другі бок стала ад назіральніка (у адрозненне ад папярэдніх выбарчых кампаній, сябры камісіі не маюць права загароджваць сваімі целамі ад назіральніка стол падліку бюлетэняў).

Трэцяя сітуацыя: назіральнік просіць даць дазвол на фатаграфаванне і відэаздымкі працэсу падліку галасоў. Матывіроўка адмовы: правы назіральніка вычарпальна акрэслены ў арт. 13 ВК і не падлягаюць пашыранаму тлумачэнню.

Эксперты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» адзначаюць, што падобныя ўстаноўкі арыентуюць выбарчыя камісіі на сумесную і адначасовую працэдуру падліку галасоў, якая не дазваляе назіральнікам непасрэдна назіраць падлік бюлетэняў. Гэта яшчэ раз падкрэслівае слушнасць прапановаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» аб урэгуляванні гэтага пытання праз адпаведную пастанову ЦВК. Указанні на тое, што назіральнікі не маюць права карыстацца фота- і відэаздымкай падчас назірання таксама абмяжоўваюць іх правы, прадугледжаныя арт. 13 ВК. Інтэрпрэтацыя правоў назіральніка як не *падлягаючых пашыранаму растлумачэнню* азначае, што іх пералік з'яўляецца *закрытым* і *вычарпальным*. Такі падыход пярэчыць тэорыі права, паколькі вычарпальным з'яляецца тое, што *забаронена*.

У выбарчых акругах г. Брэста шэраг прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат знялі свае кандыдатуры. Усіх іх аб'ядноўвае тое, што яны працуюць у бюджэтных структурах і вылучаліся ад працоўных калектываў.

## II. АГІТАЦЫЯ

Праўладныя кандыдаты актыўна ўдзельнічаюць у сацыяльна значных мерапрыемствах. Паводле мясцовых СМІ, за некалькі дзён старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, кандыдат па Докшыцкай ВА №22 Уладзімір Андрэйчанка паспеў выступіць на адкрыцці дзіцячага садка ў г.п. Ушачы Віцебскай вобл., на настаўніцкіх канферэнцыях у г. Глыбокае, а на Дзень ведаў падарыў СШ №1 г. Докшыцы камп'ютарны клас. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кандыдат па Наваполацкай ВА № 24 Вадзім Дзевятоўскі актыўна прасоўваецца СМІ Наваполацка як ініцыятар масавага мерапрыемства (рок-канцэрт пад дэвізам «Наваполацк – горад без наркотыкаў!»).

Удзел кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у акцыі пад эгідай БРСМ, якая 5 верасня збярэ каля двухсот маладых актывістаў Гродзеншчыны, анансуе на сваім сайце Гродзенскі аблвыканкам. Хто менавіта з кандыдатаў возьме ўдзел у акцыі, не паведамляецца, але мадэратарам выступіць галоўны рэдактар газеты «Гродзенская праўда», намеснік старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Павел Сухарукаў. На прадпрыемствах Рэчыцы арганізаваны сустрэчы з намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, кандыдатам па Рэчыцкай ВА №44 Баляславам Пірштуком, яго даверанымі асобамі і інш.

Працягвае выкарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кандыдат па Светлагорскай ВА №46 Галіна Філіповіч. На яе сустрэчы з выбарцамі 1 верасня прысутнічалі кіраўнікі прадпрыемстваў горада, а таксама задзейнічаны брыгады БРСМ. Мела станоўчы рэзананс публікацыя інфармацыі пра тое, што сустрэчы кандыдата Галіны Філіповіч адбываюцца без папярэдніх паведамленняў: цяпер у графік кандыдата ўнесены карэктывы. Аднак такая практыка не паўсюль: у рэгіёнах адміністрацыі ўтойваюць звесткі пра час і месца сустрэч праўладных кандыдатаў ад іх канкурэтнаў па выбарчай акрузе. Падобная сітуацыя адзначаецца, напрыклад, у выбарчых акругах №1 і № 2 г. Брэста.

Маніпуляцыі з інфармацыяй аб сустрэчах кандыдатаў з выбарцамі заўважаны на сайтах адміністрацый раёнаў г. Мінска. З іх грамадскасць можа даведацца пра агітацыйныя мерапрыемствы выключна праўладных кандыдатаў. Напрыклад, сайт адміністрацыі Маскоўскага раёна дае расклад сустрэч толькі трох кандыдатаў па трох выбарчых акругах: Ігара Камароўскага ў Паўднёва-Заходняй ВА №98, Людмілы Макарынай-Кібак у Грушаўскай ВА №99 і Аксаны Гайдук у Ясенінскай ВА №100. Інфармацыі пра сустрэчы астатніх 12 кандыдатаў, якія ідуць па гэтых акругах, няма. Аналагічная сітуацыя на сайтах адміністрацый Савецкага, Завадскога раёна сталіцы.

Зафіксаваны выпадкі дыскрэдытацыі апазіцыйных кандыдатаў. У сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» з'явіліся відэаролікі з фальсіфікаваным гукам. Абразлівы кантэнт гэтых ролікаў датычыўся сумеснага пікета кандыдата па Віцебскай-Чкалаўскай ВА №18 Таццяны Севярынец, кандыдатаў па Віцебскай-Чыгуначнай ВА №19 Алены Шабуні і Георгія Станкевіча. Пасля пікета 27 ліпеня на гэтых кандыдатаў аказвалі ціск супрацоўнікі міліцыі, складзены пратакол за парушэнне арт. 23.34 КоАП за ўдзел у несанкцыянаванай вулічнай акцыі.

Адзначаны факты перашкод з боку ўлады для асобных кандыдатаў. На тэрыторыі Гомельскай-Навабеліцкай ВА №36, паводле звестак назіральніка, апазіцыйных кандыдатаў не дапускаюць да сустрэчы з працоўнымі калектывамі на прадпрыемствах. У Полацку ў адной з гандлёвых кропак кандыдату ад партыі БНФ па Полацкай гарадской ВА №27 Вользе Дамаскінай не дазволілі вывесіць агітацыйную прадукцыю, пры тым што інфармацыя пра іншага, праўладнага кандыдата па гэтай акрузе ўжо была размешчана. Пытанне было вырашана толькі пасля размоў з адміністрацыяй. Кандыдату ад Беларускай партыі «Зялёныя» па Светлагорскай ВА №46 Юрыю Ляшэнку таксама давялося пераадолець адміністрацыйныя перашкоды, каб павесіць сваю агітацыйную прадукцыю і інш.

Кандыдату ад АГП па Баранавіцкай-Заходняй ВА №5 Мікалаю Чарнавусу гарадскія ўлады не дазваляюць рабіць пікет у адным з папулярных месцаў горада. Цяперашні дэпутат Палаты прадстаўнікоў з Баранавіч Вольга Палітыка, якая ідзе па гэтай акрузе, заявіла, што не хоча, каб побач з яе пікетамі стаялі кандыдаты ад апазіцыі. Адмаўляючы Мікалаю Чарнавусу ў правядзенні пікета ў дазволеным месцы, улады спасляліся на меркаванне «аднаго з кандыдатаў». Пытанне застаецца пакуль нявырашаным.

1 верасня на тэлеканале «Беларусь-3» адбыўсяся эфір тэледэбатаў кандыдатаў па Бярозаўскай ВА №9, сябра АГП Аляксандра Кабанава і сябра БПЛ «Справядлівы свет» Аляксандра Мельніка. Некаторыя выказванні Аляксандара Кабанава былі выразаныя.

2 верасня стала вядома, што былы прэтэндэнт у кандыдаты па Крычаўскай ВА № 83, супрацоўнік Следчага камітэта Павел Зінін звольнены з працы. Паводле яго слоў, удзел у выбарчай кампаніі не быў санкцыянаваны ўладамі, у выніку чаго на працоўным месцы на яго пачалі аказваць ціск. Прадстаўнікі Следчага камітэта падкрэслілі, што сувязі паміж звальненнем і ініцыятывай Зініна ўдзельнічаць у выбарах няма[3].

## III. СМІ

29 жніўня Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў адмовіла ў запрашэнні прадстаўніка РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» на пасяджэнне Назіральнага савета па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў СМІ[4]. Як адзначана ў адказе ЦВК, прадугледжаныя выбарчым заканадаўствам правы нацыянальных назіральнікаў, акрэдытаваных на выбарах пры выбарчых камісіях, даюць права на ўдзел у пасяджэннях адпаведных камісій. Адносна прысутнасці на пасяджэннях Назіральнага савета па кантролі за СМІ гаворыцца, што, згодна з існуючай практыкай, на гэтыя пасяджэнні дапускаюцца спецыяльныя аналітыкі па СМІ доўгатэрміновых місій міжнародных назіральнікаў. У тэлефоннай размове загадчыца арганізацыйна-кадравага аддзела ЦВК Алена Дзмухайла заявіла прадстаўніку РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт», што ў міжнародных назіральнікаў больш правоў, чым у нацыянальных. Эксперты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» адзначаюць, што праца Назіральнага савета па кантролі за СМІ па-ранейшаму закрыта ад грамадскасці: ЦВК не паведамляе пра характар разгледзеных спрэчак і вынікі іх разгляду.

---

[3] Даступна на: http://news.tut.by/politics/510544.html.

[4] Далей - Назіральны савет па кантролі за СМІ.

Дзейнасць апазіцыйных кандыдатаў практычна ігнаруецца дзяржаўнымі СМІ, у той час як актыўнасць кандыдатаў ад улады асвятляецца шырока.

Газета «Гродзенская праўда» дае праграмы кандыдатаў толькі ў суботніх нумарах малымі накладамі (6 700 асобнікаў), пры тым, што ў чатырох выбарчых акругах Гродна жыве каля 230 000 выбарцаў. Для параўнання: наклады газеты па серадах з праграмай ТБ складаюць каля 22 000 асобнікаў.

З падобнай праблемай напярэдадні выбараў сутыкнуўся кандыдат па Брэсцкай-Памежнай ВА №4, кіраўнік абласной арганізацыі БСДП (Грамада) Ігар Маслоўскі. У скарзе ў АВК і рэдакцыю газеты «Вячэрні Брэст» ён указаў на тое, што ягоная перадвыбарчая праграма была апублікавана ў №67 гэтай газеты накладам 4 300 асобнікаў. Разам з тым, перадвыбарчая праграма цяперашняга дэпутата Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Базанава, які ідзе па гэтай жа акрузе, таксама апублікавана ў газеце «Вячэрні Брэст», але ў ранейшым нумары, наклад якога 10 000 асобнікаў.

## IV. ЗВАРОТЫ

31 жніўня назіральнік кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Раман Юргель атрымаў адказ з ЦВК на свой зварот адносна публікацый у газеце «Гродзенская праўда» і на адпаведнай інтэрнэт-старонцы матэрыялаў, якія можна ацаніць як прыхаваную агітацыю ў падтрымку праўладных кандыдатаў. У адказе паведамляецца, што пытанне назіральніка разгледжана на пасяджэнні Назіральнага савета па кантролі за СМІ. Газеце «Гродзенская праўда» рэкамендавана ўстрымацца ад падобных публікацый, якія падчас выбараў могуць разглядацца як прыхаваная агітацыя. Адначасова Назіральны савет па кантролі за СМІ звярнуў увагу Гродзенскай абласной выбарчай камісіі на неабходнасць узмацнення кантролю за выкананнем правілаў перадвыбарчай агітацыі ў СМІ.

31 жніўня Віктар Данільчык, які ідзе кандыдатам ад АГП па Гродзенскай-Кастрычніцкай ВА №50, падаў скаргу ў Гродзенскую абласную выбарчую камісію на адмову АВК №50 размясціць некаторыя свае біяграфічныя звесткі на стэндах у памяшканнях участкаў для галасавання. У сваім рашэнні АВК №50 спасылалася на тое, што пададзеныя кандыдатам звесткі не маюць дакументальнага пацверджання, але могуць быць размешчаныя кандыдатам у іншых яго агітацыйных матэрыялах. Рашэннем Гродзенскай абласной выбарчай камісіі ад 2 верасня 2016 г. у задавальненні гэтай скаргі адмоўлена.